УДК 94(476)«1941/1945»

У. Ю. Сарачынская,
курсант 1-га курса факультэта міліцыі
Магілёўскага інстытута МУС
Навуковы кіраўнік: А. Я. Ігнатовіч,
дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін
Магілёўскага інстытута МУС,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

ДЗЕЙНАСЦЬ ПЕТРАПАЎЛАЎСКАЙ ЦАРКВЫ АГ. ВЕНЗАВЕЦ ДЗЯТЛАЎСКАГА РАЁНА ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Петрапаўлаўская царква ў аг. Вензавец была сведкам многіх падзей, якія адбываліся на тэрыторыі нашай краіны. І Вялікая Айчынная вайна не выключэнне. Аб дзейнасці Вензавецкай Петрапаўлаўскай царквы можна даведацца з архіўных крыніц, а таксама з успамінаў, запісаных аўтарам. Мэта даследавання — ахарактарызаваць дзейнасць храма ў дадзены перыяд.

Петрапаўлаўская царква ў аг. Вензавец вядзе сваю гісторыю з 1775 г. [1]. З метрычных кніг храма, хоць і ўскосна, давялося вызначыць, што Петрапаўлаўская царква працягвала сваю дзейнасць і ў гады Вялікай Айчыннай вайны (пісьмовыя крыніцы захаваліся толькі да 1943 г.) [2; 3]. У гады вайны пастырскую дзейнасць ажыццяўляў святар Аляксандр Мікалаевіч Семашкевіч (прыкладна да 1955 г.). Метрычная кніга Вензавецкага храма за 1941 г. вядзецца з чэрвеня 1941 г. Можна меркаваць, што гэта другая палова кнігі, а першая не захавалася. Па даных гэтай кнігі, святару Аляксандру Семашкевічу дапамагаў у здзяйсненні царкоўных таінстваў дзяк Мікалай Малашка. Яго ўдзел у жыцці Вензавецкага прыхода прасочваецца да 28 снежня 1941 г. [2]. Да мая 1942 г. усе таінствы здзяйсняў святар. З мая і да 15 кастрычніка 1942 г. Аляксандру Семашкевічу дапамагаў псаломшчык Георгій Філіповіч. У перыяд з 5 па 16 ліпеня 1943 г. царкоўныя справы здзяйсняў святар Беліцкай царквы Мікалай Краўчанка. У 1943 г. рэлігійныя дзеянні здзяйсняліся толькі Семашкевічам. Дакументы храма, якія сведчаць пра яго жыццё падчас вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, не захаваліся.

Аналізуючы метрычныя кнігі, можна прыкладна акрэсліць вобласць распаўсюджвання дзейнасці святара Вензавецкай Петрапаўлаўскай царквы. Гэта вёскі Вензавец, Юравічы, Белякі, Жадзейкі, Сверплевічы, Руда Яварская, Кашкалы, Гута, Буйкі, Хомічы, Драбавічы, Гербялевічы, Задвор’е, Маскаўцы, Гірычы, Міклашы, Нагародавічы, Воля, Капці, Рэпіца [3]. Гледзячы на такі

вялікі тэрытарыяльны абхват, можна меркаваць аб тым, што святароў у гады вайны на тэрыторыі Дзятлаўскага раёна было мала.

Пра жыццё Вензавецкага храма змагла ўзгадаць жыхарка в. Вензавец Алена Віктараўна Валанцэвіч. З яе успамінаў: «Усіх салдатаў, якіх пабілі немцы, як вайна была, пяць ці шэсць пахавалі тут, каля царквы… Пахавалі ў агульную магілу… З левага боку ад царквы, як ідзеш да яе»*. Алена Віктараўна расказала, чаму не захаваліся царкоўныя дакументы: «На гары царквы кнігі ляжалі царкоўныя. Мы ўсе іх паскідалі, і бацюшка іх папаліў. Бо там галубы ляталі і надта іх пашкодзілі. Сабралі людзей, усё гэта апраталі, і спалілі і забілі тыя дыркі, дзе галубы ляталі, каб яны больш не сталі лётаць».

У гады вайны святар Аляксандр Семашкевіч аказваў маральную падтрымку насельніцтву. Вёў гутаркі з гаспадарамі двароў, даваў рэкамендацыі, як сябе паводзіць пры сустрэчы з немцамі, якія чытаць малітвы ў цяжкую хвіліну. Але, акрамя псіхалагічнай падтрымкі, святар дапамагаў і матэрыяльна, аб чым узгадваюць сведкі. Пра жыццё і дзейнасць Аляксандра Семашкевіча змагла ўзгадаць яшчэ адна жыхарка в. Вензавец — Зінаіда Уладзіміраўна Шапурка: «Сям'я святара мела шмат козаў, і матушка малако гэтых козаў раздавала ў сем'і, дзе жылі малыя дзеці. Кожны тыдзень бацюшка абходзіў сем'і, у якіх было шмат дзяцей, і цікавіўся, што ім патрэбна. А сем'і ў той час былі вялікія, і трэба было працаваць на полі, і бывала так, што не было з кім пакінуць малых дзетак. І гэтых малых дзетак забірала да сябе матушка, пакуль бацькі былі на працы. Таксама святар заклікаў сваіх прыхаджан да дапамогі храму, сам браў малаток і рамантаваў храм. Але ў большай ступені рабіў усё самастойна. У гады вайны айцец Аляксандр праяўляў вялікую чалавечнасць. За хрышчэнне, адпяванне ён не браў грошай, а толькі прасіў дапамогі па гаспадарцы».

Такім чынам, можна зрабіць вывад аб тым, што ў жыхароў в. Вензавец у гады вайны была надзейная духоўная апора, якая натхняла на веру ў лепшае жыццё і Перамогу: падтрымка святара дапамагала мясцовым жыхарам перажыць цяжкасці Вялікай Айчыннай вайны.

1. Пракоф'еў І. Гісторыя вёскі Вензавец // Перамога. 1993. 20 лют. С. 8. Вернуться к статье

2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1799. Воп. 3. Арк. 24. Вернуться к статье

3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1799. Воп. 4. Арк. 40. Вернуться к статье

* Тут і далей: успаміны жыхароў в. Вензавец Дзятлаўскага раёна Гродненскай вобласці запісаны аўтарам артыкула ў 2022 г.